ЗЛАЧЫННАСЦЬ АДСТУПАЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка задаволены вынікамі работы МУС у 2013 годзе. Такую ацэнку кіраўнік дзяржавы даў 14 студзеня, прымаючы з дакладам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў надаўняе прысуджэнне дзяржаўных узнагарод кіраўніцтву сілавога блока. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта перш за ўсё ацэнка вынікаў работы за мінулы год. «Міністэрства абароны правяло вельмі маштабнае вучэнне, і, вядома, у гэтым вельмі вялікая заслуга міністра — Юрыя Жадобіна. І тое, што дзясяткі ваенных гарадкоў адвялі з руін і попелу, прывялі ў нармальны стан, і тое, што ў нас армія адчувае сябе як армія, і тое, што мы вызначыліся на перспектыву — гэта вялікая яго заслуга», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Узнагароду старшыні КДБ Валерыю Вакульчыку Прэзідэнт растлумачыў яго вялікім асабістым укладам у стварэнне Следчага камітэта.

Што датычыцца ўзнагароджання міністра ўнутраных спраў, то кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў яго склалася добрае меркаванне аб рабоце міліцыі ў мінулым годзе. «Міліцыя працавала нядрэнна. Гэта не для пахвалы. Вы ведаеце, што я не вельмі люблю захвальваць людзей, але тым не менш трэба аддаць належнае», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў дакладзь аб існуючых праблемных пытаннях у міністэрстве, а таксама аб сітуацыі з кадрамі, наколькі атрымалася яе змяніць у МУС і падначаленых структурах у сувязі з праведзенай рэарганізацыяй. Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што вынікі дзейнасці як МУС, так і іншых сілавых ведамстваў, пракуратуры, будуць разгледжаны пазней.

Міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч далажыў аб некаторых пытаннях развіцця сістэмы МУС у будучым, прапанаваўшы шляхі далейшага ўдасканалення і рэфармавання.

Гаворачы аб выніках работы за 2013 год, міністр адзначыў, што ўдалося дабіцца зніжэння агульнага ўзроўню злачыннасці. Так, у мінулым годзе зарэгістравана амаль на 12 тыс. менш заяў і паведамленняў аб злачынствах. Скарацілася колькасць злачынстваў, учыненых раней судзімымі асобамі і непаўналетнімі. На думку Ігара Шуневіча, станоўчых вынікаў удалося дабіцца дзякуючы прафілактыцы правапарушэнняў.

Акрамя таго, меры, якія прымаюцца ў дзяржаве, далі магчымасць дабіцца зніжэння траўматызму і смяротнасці на дарогах. Так, амаль на 26 працэнтаў зменшылася колькасць парушэнняў скорасных рэжыму, і як вынік — знізілася колькасць загінулых і раненых грамадзян.

Па выніках даклада кіраўнік дзяржавы вызначыў Міністэрству ўнутраных спраў задачы для рэалізацыі ў бліжэйшай перспектыве і даў даручэнні, накіраваныя на далейшае ўдасканаленне дзейнасці органаў унутраных спраў.

ПАЦЯПЛЕННЕ НЕ НЯСЕ НЕБЯСПЕКІ АЗІМЫМ

Непрывычныя для Беларусі плюсавыя тэмпературы ў сярэдзіне зімы не павінны негатыўна паўплываць на азімыя збожжавыя. У гэтым запэўніў карэспандэнта БЕЛТА першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід МАРЫНІЧ.

«Небяспекі для азімых збожжавых культур няма, — сказаў першы намеснік міністра. — Як мы ведаем, вегетацыя раслін адбываецца пры сярэднясутачнай тэмпературы 5 градусаў цяпла і вышэйшай. За ўвесь перыяд пацяплення ў Беларусі такой тэмпературы не было». Пры гэтым Леанід Марыніч звярнуў увагу, што ў краінах Заходняй Еўропы такія тэмпературы зімой з'яўляюцца нормай, і азімыя нармальна пераносяць зімоўку.

■ Турызм

РАСІЯНЕ ПАЛЮБІЛІ МІНСК

Мінск увайшоў у тройку самых наведвальных расіянамі гарадоў СНД у 2013 годзе. Пра гэта паведамляе расійскі сэрвіс анлайн-браніравання атэляў Oktogo.ru.

Акрамя сталіцы Беларусі, у тройку ўвайшлі Кіеў і Адэса. Далей у рэйтынгу наведванняў ідуць Кішынёў, Алма-Ата, Баку, Львоў, Астана, Ерэван і Ташкент.

Рэйтынг Oktogo.ru складзены на аснове даных браніравання гасцініц расіянамі ў краінах СНД у 2013 годзе. У параўнанні з 2012 годам колькасць тураў па гарадах СНД, забраніраваных расіянамі праз інтэрнэт, вырасла больш як у два разы.

У 2013 годзе расіяне падарожнічалі ў Мінск у сярэднім на тры дні. Найбольшай папулярнасцю карысталіся ў расійскіх турыстаў такія выдатныя мясціны, як Свята-Духаў кафедральны сабор на плошчы Свабоды, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Пішчалаўскі замак, абеліск на плошчы Перамогі і Траецкае прадмесце. ■

Свидетельство о государственной регистрации, печати и штампы Частного торгового унитарного предприятия «Шоттогр» (Минская область, Минский район, аг. Луговая Слобода, д. 86, пом. 36, УНП 691428480) **считать недействительными.**

Справаздача
Міжнароднага дабрачыннага фонду «Праект дапамогі дзецям Чаробыля» аб скарыстанні сваёй маёмасці за 2013 год

1. Колькасць заснавальнікаў Фонду — 8.
2. Набытая маёмасць — 2 будынкі (адзін — з мэтай заснавання дзіцячага дома сямейнага тыпу, другі — з мэтай заснавання дома незалежнага пражывання маладых інвалідаў).
3. Грашовыя сродкі, паступіўшыя ад заснавальніка ў якасці заможнай дабрачыннай дапамогі, — 329 572 еўра.
4. Грашовыя сродкі, паступіўшыя ад грамадзян Рэспублікі Беларусь, — 1 077 500 беларускіх рублёў.
5. Агульная сума расходаў, панесеных Фондам на дасягненне грамадска-карысных мэтаў, адзначаных статусу, — 4 495 884 967 беларускіх рублёў.
6. Прадпрымальніцкай дзейнасці Фондам не вялася.

УНП 805001004

Печать Частного торгового унитарного предприятия «РусМежТорг» (Минский р-н, п. Лесной, ул. Фабричная, 2а, пом. 5/9, УНП 691458445) **считать недействительной.**

НАВАСЕЛЛЕ ЧАКАЕЦЦА Ў ЛІПЕНІ

Андрэй Кабякоў, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у рамках семінара «Аб удасканаленні работы будаўнічай галіны» наведаў Жодзіна і на свае вочы пабачыў, як на радзіме славутых самазвалаў узводзяць у строй даўгабуды.

Яшчэ ў снежні Камітэт дзяржаўнага кантролю прывёў далёка не самую прыгожую статыстыку. Аказваецца, у Мінскай вобласці найбольшая колькасць праблемных дамоў. У ліпені 2013 года ў спіс трапіла 106 будоўляў. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў на вырашэнне праблемы 6 месяцаў.

— Мы ўжо выканалі праграму 2013 года. Увялі ў строй 4 жылыя шматпавярховыя дамы. А гэта агулам амаль 500 кватэр, — тлумачыць сітуацыю **Канстанцін КУШНЕР, намеснік старшыні Жодзінскага гарвыканкама.** — А цяпер мы закрываем графік па ўводзе праблемных дамоў. Спадзяёмся на рытмічнае фінансаванне. Сёлета неабходна здаць 4 дамы.

Адным з даўгабудаў з'яўляецца дзевяціпавярховік на 230 кватэр па Лагойскай вуліцы, што на ўскрайку горада. Менавіта сюды і прыехаў Андрэй Кабякоў. Кіраўніка Адміністрацыі асабліва цікавілі тэрміны здачы пабудоў і шляхі вырашэння праблем, бо, як прызнаўся **Міхаіл АМЕЛЬЯНЧУК, старшыня Жодзінскага гарвыканкама,** ёсць пэўныя пытанні з фінансаваннем. Усе даўгабуды павінны быць здадзены да ліпеня.

Тарас ШЧЫРЫ.
г. Жодзіна.

■ Год гасціннасці: пытанні і адказы

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

На чэмпіянат свету прыедуць у асноўным маладыя людзі, музеі пачнуць працаваць пазней, а асобнай спецыяльнасці па агратурызме пакуль не прадугледжана

У 2014-м, аб'яўленым у Беларусі Годам гасціннасці, пра тое, як і чым завабіць іншаземнага турыста, мы будзем гаварыць яшчэ не раз. Пакуль жа, паводле слоў Вадзіма КАРМАЗІНА, дырэктара дэпартамента па турызме, сёння толькі каля 10-15 працэнтаў турфірмаў займаюцца турызмам «на ўезд», нягледзячы на тое, што тым, хто развівае ўязны турызм, прапануюцца льготы па аплаце ПДВ. Яно і зразумела: выязны турызм у нас сёння нашмат больш папулярны. Пра гэта і іншае Вадзім Кармазін расказаў падчас інтэрактыўнага дыялогу ў рамках анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА.

Хто прыедзе на чэмпіянат свету?

«У асноўным да нас будуць ехаць госці з краін, каманды якіх удзельнічаюць у чэмпіянаце. На працэнтаў 70 мы чакаем расіян, пра тое, што іх будзе большасць, сведчыць продаж білетаў. Актыўна купляюць білеты з краін Скандынавіі, а таксама з Латвіі, Літвы; каля 5 працэнтаў выкуплена грамадзянамі Канады і ЗША.

Балельшчык — гэта асаблівы турыст. Найперш яго цікавяць самі спартыўныя мерапрыемствы, а таксама размяшчэнне, аб'екты харчавання. Мы рэальна ацэньваем сітуацыю і не чакаем, што ўсе будуць заказваць экскурсійныя праграмы. Мы разлічваем на тое, што ў Мінску адначасова будзе 20 тысяч заўзятараў штодзённа, і гэта толькі тыя, хто прыедзе на матчы.

Нават у залежнасці ад нацыянальнасці турыста ёсць спецыфіка. Немцы, напрыклад, больш сямейныя людзі, будуць групамі прыязджаць. З Польшчы ці Літвы прыбудзе больш індывідуальных турыстаў. Сярэдні ўзрост гасцей ЧМ-2014 будзе, як мяркуем, да 35 гадоў — найбольш актыўных людзей, якія любяць падарожнічаць».

Ці падстроіцца пад турыстаў музеі?

«Асноўныя аб'екты Мінска, напрыклад, мастацкі, гістарычны і іншыя музеі павінны адназначна працаваць не да 18 гадзін. Мы паставілі задачу да 1 лютага вызначыць аптымальны рэжым работы, каб задаволіць пажаданні турфірмаў і гасцей, якія вандруюць самастойна. Дадзена даручэнне, каб без выхадных працавалі турыстычна-інфармацыйныя цэнтры краіны, асабліва ў Мінску. На круглясутачны рэжым работы неўзабаве прыйдзе і тураператар «Цэнтркурорт», дзе плануецца стварыць «гарачыя лініі» і кол-цэнтры для дапамогі турыстам у рашэнні праблем, якія ўзнікнуць. А на чыгуначным вакзале будзе працаваць каардынацыйны цэнтр для вырашэння пытанняў на транспарце: хтосьці згубіў білет, хтосьці адстаў ад групы і да т.п.»

«Гастранамічны турызм» у модзе

«Падобныя ініцыятывы падтрымліваюцца. Ужо шосты раз праводзіцца традыцыйны фестываль «Мотальскія прысмакі», які набыў турыстычную накіраванасць. Летась у Мінску прайшоў кулінарны фестываль. Акрамя таго, адна з кафедраў БДУ актыўна займаецца адраджэннем нацыянальнай кухні і тым, як яе падносіць турыстам.

У праекце плана мерапрыемстваў па Годзе гасціннасці значыцца арганізацыя рэспубліканскага сырнага фестывалю, які пройдзе ў Мінску ці пад Мінскам».

Фота БЕЛТА

Як будуць рыхтаваць спецыялістаў турындустрыі і ці стане ўсмешка абавязковым атрыбутам нашага абслугоўвага персаналу?

«У нас пэўны перабор на гэтым рынку: падрыхтоўку вядуць 20 ВНУ і 6 ССНУ, яшчэ 6 ВНУ займаюцца перападрыхтоўкай. Кожны год 2,8 тысячы чалавек выпускаюцца на рынак турызму. Але мы сутыкаемся з праблемай нізкай практычнай арыентаванасці навучання. Выпускнікам нестае і практыкі на нашых прадпрыемствах, і замежных стажыровак.

Мы сталі вельмі асцярожна падыходзіць да ўвядзення новых спецыяльнасцяў у гэтай сферы: іх шмат. Каб не пакідаць выпускнікоў без работы. Напрыклад, прапрацоўвалася пытанне асобнай спецыяльнасці па агратурызме, але, думаю, пакуль дастаткова абмежавацца курсамі павышэння кваліфікацыі. Не ўяўляю, як на працягу пяці гадоў можна навучаць такой спецыяльнасці.

Справа не толькі ва ўсмешках, а і ў захаванні тых стандартаў, якія аб'ект турызму на сябе бярэ. Калі гасцініца «пяць зорак», тут жа трэба ўсміхацца без усялякіх чэмпіянатаў, як, між іншым, і ў астатніх гатэлях — гэта законнае патрабаванне да любой сферы абслугоўвання».

Ці лёгка іншаземцу арыентавацца ў Беларусі?

«Многія нашы замежныя госці адзначаюць, што беларускія дарогі зручныя і інфарматыўныя, на іх лёгка зарыентавацца і знайсці патрэбны населены пункт. Але пакуль не хапае дарожных паказальнікаў. За мінулы год мы сумесна з Мінкультам і Мінтрансам устанавілі паказальнікі па ўсіх літаральна аб'ектах так званай нулявой катэгорыі (гэта аб'екты са спіса гісторыка-культурнай спадчыны). Усяго ў рэгіёнах выраблена і ўстаноўлена 1700 знакаў рознай накіраванасці. Але больш нас хвалююць населеныя пункты, менавіта там важна забяспечыць добры ўзровень арыентавання. У гэтым плане Мінск сур'ёзна падцягнуў работу: і метрапалітэн, і вулічныя паказальнікі. Як паказвае апытанне, узровень інфарматыўнасці ў сталіцы людзей задавальняе».

Як рэкламаваць свае турыстычныя магчымасці за мяжой?

«Пачала працаваць новая версія сайта www.belarustourism.by, дзе створаны новы інтэрфэйс і ўдасканалена сістэма навігацыі. Развіваецца сістэма электроннага браніравання. З'явілася мабільная экскурсія па Верхнім горадзе ў Мінску.

Сёлета будзе арганізавана работа нацыянальнага стэнда на міжнародных турыстычных выставах Adventur (Вільнюс), EMITT (Стамбул), IMTM (Тэль-Авіў), ITB (Берлін), Intourmarket (Масква), WTM (Лондан), Tour & Travel (Варшава).

Да чэмпіянату свету па хакеі на падставе праведзенага конкурсу выбраны генеральны турыператар — «Цэнтркурорт». Заключаны дагаворы аб супрацоўніцтве з турыстычнымі кампаніямі Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Польшчы, Славакіі, Швецыі, Швейцарыі, Фінляндыі, Германіі, ЗША, Канады і Італіі».

Падрыхтавала Эмілія ШЭЛЕСТ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

АПРАЦОЎВАЦЬ ЗАЯЎКІ Ў СТАЛІЦЫ БУДУЦЬ ПА-НОВАМУ

Паведаміць пра любую няспраўнасць у сталічнай камунальнай гаспадарцы можна будзе з дапамогай адзінай дыспетчарскай службы для ўсіх ЖЭС Мінска.

— Сталічная адзіная дыспетчарская служба будзе працаваць 24 гадзіны на суткі. Перш чым вам адкажа дыспетчар, трэба будзе выбраць адзін з трох прапанаваных аўтаінфарматарам варыянтаў. Мяркуецца, што іх раздзеляць у залежнасці ад характару заяўкі, — падкрэсліў **генеральны дырэктар Мінскай гарадской камунальнай гаспадаркі Уладзімір ХАДАРЦЭВІЧ.** — Далейшы лёс паведамлення будзе залежаць ад часу сутак. Удзень яго пераначкіруюць у патрэбную жыллёва-эксплуатацыйную службу сакратару. Уначы яго атрымае гарадская аварыйная служба. Дзяжурны дыспетчар абавязкова атрымае справаздачу аб выкананні заяўкі, каб праінфармаваць аб гэтым таго, хто яе падаў.

Адзіная дыспетчарская гарадская служба ЖЭС будзе працаваць у тры змены. Кожны званок будзе аўтаматычна рэгістравацца, запісвацца і захоўвацца пэўны тэрмін у спецыялізаванай камп'ютарнай базе. У адну змену паведамленні аб няспраўнасцях у сталічнай камунальнай гаспадарцы будуць прымаць каля дваццаці дыспетчараў. Ці хопіць іх сіл на двухмільённы горад? Спецыялісты запэўніваюць, што хопіць...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ВЫПЛАЧАНЫ ЧАРГОВЫ ТРАНШ КРЭДЫТУ СТЭНД-БАЙ МВФ

Беларусь учора выканала свае абавязацельствы па крэдыце стэнд-бай Міжнароднага валютнага фонду і ажыццявіла чарговае пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 64,7 млн СДР, што эквівалентна $99,2 млн. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве фінансаў.

Беларусь рэалізавала праграму стэнд-бай, падтрыманую крэдытам МВФ на $3,5 млрд, у перыяд са студзеня 2009 па красавік 2010 года. Гэта дало магчымасць краіне забяспечыць дадатную дынаміку па шэрагу пазіцый у эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы. На 2013 год прыпадаў пік выплат па крэдыце. Папярэдняе пагашэнне адбылося 30 снежня мінулага года, тады рэспубліка выплаціла 109,5 млн СДР (было эквівалентна $168,3 млн).

НА АЛІМПІЯДУ Ў СОЧЫ

...адправіліся 33 супрацоўнікі «Магілёўаблаўтатранса». Разам са сваімі калегамі з Беларусі (у складзе каманды больш за 300 чалавек) яны запрошаны ў Сочы, каб займацца пасажырскімі перавозкамі падчас XXII зімовых Алімпійскіх гульняў.

Гэта стала магчыма дзякуючы дамоўленасці паміж Расіяй і Беларуссю на міжурадавым узроўні. Дарэчы, «Сочыаўтатранс» заключыў з кожным аўтатранспартным аб'яднаннем краіны асобнае двухбаковае пагадненне.

— Усе нашы кандыдаты — вопытныя людзі, стаж працы якіх склаў не менш чым 5 гадоў, — адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара «Магілёўаблаўтатранса» Уладзімір СКВАРЦОЎ.** — Камандзіроўка разлічана на 70 дзён. Да пачатку Алімпійскіх гульняў нашым землякам патрэбна будзе асвоіць асаблівасці работы на горных дарогах, атрымаць тэхнічны мінімум па правілах дарожнага руху, азнаёміцца з назвамі населеных пунктаў. Не выключана, што працаваць яны будуць на аўтобусах Мінскага аўтамабільнага завода, якія ў колькасці 250 адзінак набылі нашы суседзі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЁЛКІ ПАДАЮЦЬ АД ВЕТРУ

Моцны вецер стаў прычынай падзення навагодніх ёлак у розных гарадах Брэстчыны. Спачатку такое надзвычайнае здарэнне бура ўчыніла ў Белаазёрску.

Навагодняе дрэва павалілася на галоўнай плошчы горада. Цікава, што пры гэтым ілюмінацыя не адключылася, ёлка працягвала зязць, лежачы на баку.

Парыў ветру ўчыніў такі ж злы жарт і з галоўнай ёлкай у Лунінцы. 15-метровае дрэва не ўстаяла. На шчасце, ні ў адным з выпадкаў ніхто не пацярпеў.

Яна СВЕТАВА.

ХЛОПЧЫК ПАСЯРОД ВОЗЕРА НА ПАЛІ...

У Чэрыкаве работнікі МНС выратавалі пяцікласніка, які аказаўся пасярод возера на палі.

Пра здарэнне ўдзень паведаміў відавочца: на возеры па вуліцы Дзмітрыевай за дзесяць метраў ад берага пад лёд праваліўся чалавек. Пажарная аварыйна-выратавальная часць ад месца выкліку знаходзілася за тры кіламетры, і ўжо праз тры хвіліны работнікі МНС былі на месцы. Высветлілася, што на адлегласці 8 метраў ад берага, трымаючыся за жалезабетонную палю, знаходзіцца дзіця. Дабрацца самастойна да сушы хлопчык не мог: глыбіня тут была больш за паўтара метра. Выратавальнікі даставілі на бераг вучня 5 класа і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Дзіця ў шпіталізацыі патрэбы не мела, і яго адпусцілі з бацькам дадому.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПА САНКІ — І ПАД ЛЁД

У Віцебску недалёка ад цэнтра горада пяцікласнік, які катаўся на санках з горкі, праваліўся пад лёд на рацэ. Выратаваў хлопчыка выпадковы сведка.

— Адбылося гэта а чацвёртай гадзіне дня на праспекце Людніказа ў раёне аўтамабільнага моста «Юбілейны» цераз раку Віцьба. Вучань 5 класа сярэдняй школы № 28 потым растлумачыў, што санкі заехалі на лёд і ён пайшоў іх даставаць. На рацэ Віцьба, на адлегласці трох метраў ад берага, ён праваліўся ў ваду. Чалавек, які праходзіў міма, 21-гадовы Аляксандр Жолудзеў, выратаваў хлопчыка, — паведаміла **Марына ФАНДО, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.** Школьніка на «хуткай» адвезлі ў дзіцячую абласную клінічную бальніцу з папярэднім дыягназам «агульнае пераахаладжэнне», а яго выратавальнік адправіўся дадому.

У Віцебскім абласным упраўленні МНС у чарговы раз нагадваюць: «Будзьце асцярожныя, не заходзьце на тонкі лёд! Не дазваляйце дзецям гуляць паблізу рэк і вадаёмаў, пакуль лёд не стане трывалым і яго таўшчыня не дасягне пяці сантыметраў».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАМІЖ ДАХАМ І СТОЛЛЮ

Вялікую партыю воблераў і іншага рыбалоўнага прыладдзя знайшлі мытнікі пры даглядзе цягніка «Санкт—Пецярбург—Кіеў», які ішоў на Украіну.

Пакункамі была забіта міжстолевая прастора ў адным з вагонаў. Перад гэтым правадніка спыталі пра наяўнасць тавараў, што трэба задэкларыраваць. Грамадзянін Украіны ад прапановы адмовіўся. Як расказалі ў Гомельскай мытні, праверка праходзіла ў пункце мытнага афармлення «Церуха». Былі знойдзены блешні, балансіры, рыбалоўныя шнуры і іншае (усяго 493 адзінкі) на суму каля Br60 млн.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАРАЧКА «ПРАМЫШЛЯЛА» Ў САЎНЕ

З саўны па вуліцы Захарава ў сталіцы крымінальны дуэт у складзе маладога чалавека і дзяўчыны скралі дарагі ноўтбук і мабільны тэлефон.

Пакуль хлопец выглядваў, чаму б можна было «прырабіць ногі», яго хаўрусніца спакойна размаўляла з адміністратарам і вывучала прэйскурант цэн. Як толькі яе напарнік схапіў камп'ютарную тэхніку і мабільны тэлефон і пакінуў памяшканне, паспешліва накіравалася да выхаду і сама. Прапажу адміністратар саўны выявіла літаральна праз некалькі хвілін. Зараз праваахоўнікі вышукваюць парачку, якая нанесла шкоду арганізацыі на суму сем мільёнаў рублёў. Паводле інфармацыі Партызанскага РУУС г. Мінска, ёсць падставы меркаваць, што гэта далёка не адзіная злачынства крымінальнага дуэта.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫНІКІ ЧС-2014 ПРАДКАЖА ПЯТРОВІЧ

Краб-гігант па імені Пятровіч, які, як чакаецца, будзе прадказваць вынікі ЧС-2014 па хакеі, засяліўся ў спецыяльны акварыум, стылізаваны пад хакейную пляцоўку, ва ўласнай Зімовай зале мінскага цэнтра акіянаграфіі «Адкрыты акіян». Менавіта ў гэтай зале краб будзе прадказваць вынікі гульняў чэмпіянату.

Фота БЕЛТА

■ Факт

КАНТРАБАНДУ СПЫНІЛІ

Супрацоўнікі Віцебскай мытні перашкодзілі незаконнаму ўезду двух кантрабандных грузавых аўтамабіляў «Вольва».

— Аўтамабілі ўязджалі на тэрыторыю Мытнага саюза ў якасці транспартных сродкаў міжнароднай перавозкі. Перавозчык — фірма, зарэгістраваная ў Літве. Грамадзяне гэтай краіны пры дэкляраванні ўказалі, што грузавікі ехалі парожнякам пад загрузку пенапласту. Але высветлілася, што гэта не адпавядае рэчаіснасці, — паведамілі «Звяздзе» ў мытні.

«Вольва» хацелі ўвезці без выплаты мытных плацяжоў. Два аўтамабілі агульным коштам больш як 2 мільярды рублёў канфіскаваны. Праводзіцца далейшая праверка ў рамках адміністрацыйнага працэсу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ ■

«ЗАМЕСТ ЗОЛАТА — ЗЗЯННЕ ЧЫСТЫХ СЛОЎ І СПРАЎ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памятаючы, колькі людзей прыйшло ўлетку да крыжа святога Андрэя Першазванага, варта разлічваць менавіта на другі варыянт развіцця падзей. Хоць на выхадныя сіноптыкі абяцаюць да 18 градусаў марозу, наўрад ці зімовая сцюжа здольная будзе паўплываць на жаданне вернікаў скарыстаць унікальную магчымасць пабачыць святыню на ўласныя вочы і дакрануцца да яе. Асаблівa гэта датычыцца жанчын: Дары валхвоў пастаянна захоўваюцца ў манастыры святога Паўла на святой гары Афон, на якую, як вядома, трапіць могуць выключна мужчыны.

У любым выпадку мінская міліцыя абяцае забяспечыць грамадскі парадак ля Дома Міласэрнасці, дзе ў бліжэйшыя дні збяруцца тысячы паломнікаў з усёй краіны. Як заявіў нядаўна намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ахоўы правапарадку і прафілактыкі МУС падпалкоўнік міліцыі Іван Кубракоў, цяпер адсочваецца сітуацыя ў Расіі, дзе знаходзіцца святыня, пераймаецца досвед калег па мерах перасцярогі. Праўда, праваахоўнікі адзначаюць, што пра нейкія парушэнні грамадскага парадку гаварыць не даводзіцца: людзі прыходзяць да святынь са светлымі думкамі і намерамі, таму і неабходнасць стаяць у чарзе ўспрымаюць спакойна і добразычліва. Тым не менш месца, дзе будзе знаходзіцца святыня, і тэрыторыю вакол возьмуць пад кругласутачную ахову. А ДАІ ўжо прадугледзела, дзе тыя, хто прыедзе на ўласным аўто, змогуць без праблем яго паставіць. У выпадку неабходнасці, па прыкладзе Масквы, будуць стаяць і аўтобусы, дзе можна будзе пагрэцца.

Вядома, што з Афона даставяць толькі частку дароў — адзін з дзесяці існуючых каўчэгаў. Іх, дарэчы, ніколі не вывозяць усе разам: з-за вялікай каштоўнасці — найперш, безумоўна, духоўнай. Дары захоўваюцца ў рызніцы манастыра святога Паўла. Тых, што зможам пабачыць мы, — гэта тры залатыя ўпрыгожанні — два ў форме трапецыі і адно прамавугольнае. Яны зусім невялікія — прыкладна 4-5 сантыметраў на 4-6, таўшчыня ўсяго тры міліметры. Да іх прымацаваны сярэбраныя пацеркі з нанізанымі шарыкамі з ладану і міры і жамчужынамі. Захоўваюцца яны ў сярэбраным чаканным каўчэгу, даўжыня якога 40 сантыметраў, шырыня — 27, а вышыня — 15.

Дарэчы, як сказана ў дакуменце, які манастыр святога Паўла распаўсюдзіў да прыбыцця дароў, тое, што святыню памясцілі ў сярэбраныя каўчэгі, — невыпадкова. Тым самым святары хацелі паказаць, што дарам належыць такое ж пакланенне, як і святым мошчам. Бо «пакланяючыся дарам, мы пакланяемся не золату і не смірне, а Божай благадаці, якая засталася на дарах «ускладанням рук Тваіх, Ісусе»...

Царква вельмі асцярожна ставіцца да паведамленняў аб цудах, якія адбываюцца ля той ці іншай святыні. Але ў афіцыйным дакуменце з Афона засведчана нямала цудаў, якія здзейсніліся Дары. Напрыклад, у жніўні 1982 года з-за маланкі зусім недалёка ад манастыра святога Паўла разгарэўся пажар. Полымя хутка бегла па высушанай летняй спёкай зямлі, яго спрабавалі патушыць, але не далі рады. Але як толькі з храма вынеслі каўчэг з дарамі, прачыталі малітву і ўзнялі святыню над месцам, дзе бушаваў пажар, вецер рэзка памяняў напрамак і полымя спынілася... А ў 2012 годзе жыхарка Грэцыі Анастасія Ангелі, якая сляпла з-за рэдкага вірусу — з ім не справіліся ўрачы, — дакранулася да часткі дароў, якія прывезлі да пакланення ў іх прыход, праз тры дні стала добра бачыць... У апошні час часта фіксуюцца выпадкі вылячэння духоўна хворых і спантанных людзей.

Насельнікі манастыра сведчаць, што «Гасподзь спрыяльна ставіцца да ўшанавання гэтай вялікай святыні, бо менавіта пасля таго, як да яе дакранецца вялікая колькасць вернікаў, Дары пачынаюць распаўсюджваць дзівосны водар. Шматлікія цуды і ацаленні таксама найчасцей адбываюцца ад дароў, калі яны знаходзяцца сярод міран».

Як правільна пакланяцца святыні? Як і мошчам, як і абрадам, перахрысціўшыся, прыкласціся да яе вуснамі. Але галоўнае, бадай, ведаць і памятаць вось гэтыя словы настаяцеля манастыра святога Паўла архімандрыта Парфенія (ён, дарэчы, суправаджае святыню з дэлегацыяй манахаў): «З якой пакорай і павагай былі прынесены гэтыя дары Госпаду! З такой жа глыбокай павагай і любоўю мы павінны пакланяцца Яму, і замест золата прынесці Яму зззянне чыстых слоў і спраў, замест ладану — малітву, замест смірны — адмову ад страсцей»...

Алена ЛЯЎКОВІЧ.